2. Лісіцкі, А. Рака майго маленства / А. Лісіцкі // Петрыкаўскія навіны. – 2011. – 16 лют. – С. 6.
3. Лісіцкі, А. Рака майго маленства / А. Лісіцкі // Петрыкаўскія навіны. – 2011. – 26 лют. – С. 8.
4. Прыпяцкая рапсодыя: нарысы / пад. агул. рэд. праф. І. Ф. Штэйнера. – Гомель: Сож, 2010. – 351 с.
5. Штэйнер, І. Песня палескага краю / І. Штэйнер // Полымя. – 2010. – № 8. – С. 159–166.

**Віталь Герцаў**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ПУБЛІЦЫСТЫКА ВАСІЛЯ ПРАСКУРАВА: УРОКІ ТВОРЧАСЦІ

Імя ў газеце – гэта не проста подпіс пад матэрыялам, гэта аўтарытэт, які цяжка заслужыць і лёгка страціць. Гадамі журналісты імкнуцца да славы. Спрабуюць многія – атрымліваецца ў адзінак. Зарабіць імя нельга, калі ты не набыў уласнага творчага почырку, па якім цябе адразу пазнае чытач, калі твае матэрыялы не адрозніваюцца глыбінёй распрацоўкі тэмы, калі ты не перажыў тое, пра што пішаш, хаця б у сэрцы, а значыць, не маеш ні жыццёвага, ні прафесійнага вопыту. Калі ты не публіцыст. Пра гэта сведчыць творчасць Васіля Фёдаравіча Праскурава, які больш за два дзясяткі гадоў узначальваў ганцавіцкую раённую газету.

Публіцыстычныя вартасці многіх нарысаў В. Праскурава, яго майстэрства як апавядальніка адзначалі У. Калеснік, У. Касько, Б. Стральцоў, У. Юрэвіч, В. Гардзей, іншыя вядомыя даследчыкі і пісьменнікі. Аднак і сёння недастаткова глыбока распрацавана тэма творчай лабараторыі публіцыста, у прыватнасці такі аспект, як сувязь творчасці В. Праскурава з творчасцю народнай.

Для даследавання праскураўскай творчасці прапануем падыход двухузроўневага аналізу. Вынікі аналізу мікраўзроўню – асаблівасці аўтарскага стылю канкрэтнага тэксту. Вынікі аналізу макраўзроўню – асаблівасці аўтарскага стылю сукупнасці тэкстаў, творчасці аўтара. Аналіз аўтарскага стылю на макраўзроўні дазволіць выявіць асаблівасці, якія належаць многім творчым тэкстам. Такія адмеціны сустракаюцца, як правіла, у кожным журналісцкім матэрыяле, з цягам часу яны ствараюць у чытача вобраз аўтара, становяцца яго ідэнтыфікатарамі.

Аўтарскі стыль пры ўсім пастаянстве мае права на развіццё. Ён адзіны ў супрацьлегласцях – пастаянстве і зменлівасці. Да змен у творчасці чуйны аналіз мікраўзроўню. У якасці аб’екта аналізу апошняга мэтазгодна выбіраць творы, якія атрымалі найбольшую вядомасць і папулярнасць у чытачоў, аказалі значны ўплыў на развіццё стылю аўтара, яго творчага напрамку.

Макрааналіз творчасці В. Праскурава, аб’ектамі якога сталі зборнікі публіцыстыкі «Людзі-суседзі», «Пакажы чалавеку дарогу», «Наўсцяж вясковай вуліцы», «Святая сівізна», «Пакланіся зямлі-карміцельцы», паказаў, што адметнай рысай аўтарскага стылю з’яўляецца выразная сувязь з беларускім фальклорам. Нарысы В. Праскурава – сапраўдная энцыклапедыя творчасці палешукоў, якая ўключае прыказкі, прымаўкі, паданні, звычаі, песні, забабоны, прыкметы надвор’я.

Мілагучнасць беларускай песні перадалася стылю В. Праскурава. Прыказкі і прымаўкі навучылі яго бачыць свет у вобразах і напоўнілі тэксты разнастайнасцю параўнанняў. Развіты асацыятыўны тып мыслення, накопленая мудрасць дазволілі публіцысту ўзбагаціць тэксты шматлікімі лірычнымі адступленнямі, філасофскімі па абагульненні рэчаіснасці і паэтычнымі па выражэнні думкі. Філасофскія высновы ў В. Праскурава часам, як і прыказкі-прымаўкі, імкнуцца да афарыстычнасці. Прыкметы надвор’я, звычаі і праклёны таксама выконваюць сваю ролю. Яны, як неад’емныя часткі паўсядзённага народнага побыту, запэўніваюць чытача ў тым, што аўтар не скажае ў тэксце рэальнасць, а паказвае жыццё такім, якое яно ёсць. Давер паміж чытачом і публіцыстам – аснова, без якой немагчыма выкананне публіцыстычнага прызначэння – уплыву на грамадскую думку.

В. Праскураў набліжаецца да ўзроўню прафесійнага этнографа дзякуючы выдатнаму ўменню слухаць, назіраць, заўважаць і чуць. Гэта ўзбагаціла творы публіцыста не толькі фалькло-

рам, але і дыялектызмамі. Кожны яго герой гаворыць уласнай мовай, што таксама спрыяе стварэнню эфекту рэалістычнасці.

Неадрыўная функцыя публіцыстыкі – функцыя ўплыву, дасягнуць якой немагчыма, калі не ўлічваць законаў масавай псіхалогіі. Выказванне, каб яно паўплывала на масавую свядомасць, павінна быць не толькі аргументаваным і змястоўным, але і эмацыянальным, простым і вобразным па форме. Да таго ж павінна падмацоўвацца аўтарытэтнасцю аўтара выказвання. Прыказкі і прымаўкі адпавядаюць усім названым крытэрыям. Акрамя таго як у прыказках, так і ў прымаўках адлюстроўваюцца няпісаныя законы, па якіх жыве народ: мараль, яго традыцыі, звычаі, характар, вера. Таму ў працы публіцыста прыказкі і прымаўкі можна прызнаць найлепшым сродкам аргументацыі, звышаргументам.

Класіфікацыя прыёмаў увядзення прыказак у тэкст В. Праскуравым:

– простае ўвядзенне;

– увядзенне з дапамогай двукосся, прыказка – частка, без якой не можа быць закончаная думка аўтара;

– увядзенне з дапамогай слова «казаць».

Прыказкі і прымаўкі нярэдка становяцца адпраўным пунктам для разваг журналіста. Ён развівае згорнутую да адной фразы думку наступным чынам:

– растлумачвае першапачатковы сэнс выразу, які пазней стаў вобразам;

– сінтэзуе, спалучае некалькі прыказак;

– працягвае прыказку (прымаўку) з захаваннем рыфмы ці рытму;

– падмацоўвае думку ўласнымі развагамі.

Аналіз творчасці В. Праскурава на мікраўзроўні (аб’ект – нарыс «Рута-мята») паказаў, што індывідуальнасць яго стылю заснавана на:

– сувязі з палескім фальклорам;

– арыгінальнасці пабудовы твора;

– наданні асаблівага значэння дэталям;

– багацці аўтарскіх параўнанняў;

– канструкцыі «Ніхто не бачыў, як...»;





– філасофскіх «лірычных адступленнях».

Як сведчыць гісторыя, тэхнічныя вынаходніцтвы спрыялі развіццю журналісцкай перыёдыкі, але ніводнае з іх не змагло ў сваім значэнні перасягнуць важнасці слоўнага майстэрства. Слова ў журналістыцы было і застаецца першаснай каштоўнасцю. Таму творчы досвед Васіля Праскурава актуальны сёння. І будзе такім жа заўтра.

**Екатерина Гуртовая**

*Белорусский государственный университет*

## ВЕРБАЛЬНАЯ СОСТАВЛЯЮЩАЯ ВИЗУАЛЬНОГО КОДА ПЕРИОДИЧЕСКОГО ИЗДАНИЯ

Фотография структурирует реальность иначе, чем слово, поэтому невозможно поставить знак равенства между этими способами репрезентации действительности. Однако значение фотоизображения – полисемического объекта – не может быть выявлено иначе, чем через процесс вербализации, когда тот или иной журналистский текст выступает в виде формулы фотоиллюстрации, согласно которой разворачивается в восприятии ее содержание. Примечательно, что в математике до изобретения формул Франсуа Виетом основные алгебраические преобразования описывались словами.

На вербальную составляющую ориентированы и современные поисковые системы, обеспечивающие в том числе нахождение изобразительной информации во всемирной сети. Поиск осуществляется при помощи описывающих фотографии ключевых слов, которые требуют совпадения с предусмотренными адресантом тегами. Отсюда в случае несовпадения терминологии адресанта и адресата необходимая фотография принципиально не находима, т.е. фактически не существует для последнего в Интернете. Или «невидима» зрителем в физическом пространстве, т.к. не обладает значимостью для него.

Эксперименты в рамках когнитивной психологии дают представление о работе головного мозга в процессе визуального восприятия, о закономерностях функционирования зрительной